# Карчэўская: У новы навучальны год — з новымі культурнымі праектамі!

01.09.2022 Аўтар: Віктар Іванчыкаў

**Дзень ведаў і рэспубліканскі адкрыты ўрок «Гістарычная памяць — дарога ў будучыню» адбыліся 1 верасня 2022 года ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў.**




На ўваходзе ў спартыўна-культурны цэнтр універсітэта ўдзельнікаў і гасцей свята сустракаў музычнымі кампазіцыямі канцэртны аркестр духавых і ўдарных інструментаў «Светач».



У выкананні маладзёжнага эстрадна-сімфанічнага аркестра прагучалі ўрачыстыя фанфары, і вядучыя запрасілі на сцэну кіраўніцтва ўніверсітэта — прафесарскі склад, загадчыкаў кафедраў і членаў рэктарата.




Рэктар універсітэта Наталля Карчэўская пазнаёміла першакурснікаў з асаблівым універсітэцкім званком, які будзе суправаджаць студэнтаў усе чатыры гады навучання.











Дзень ведаў атрымаўся па-сапраўднаму ўрачыстым: у памяшканне ўнеслі Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь і Сцяг ўніверсітэта, былі выкананы некалькі музычных нумароў і зачытаны тэкст паслання да нашчадкаў ад студэнтаў-першакурснікаў універсітэта.



Затым навучэнцы занялі месцы на трыбунах і пачаўся рэспубліканскі адкрыты ўрок «Гістарычная памяць — дарога ў будучыню», які правёў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка.

— 1 верасня заўсёды хвалюючае свята: мы сустракаем першакурснікаў, і ім неабходна паказаць, што мы іх чакаем, што яны для нас важныя. Што мы ім можам пажадаць? Працаваць, таму што без працы не будзе поспеху ў любой справе. Мы працуем на карысць Беларусі, на карысць нашай культуры. У мінулым навучальным годзе Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь уручыў калектыву нашага ўніверсітэта спецыяльную прэмію За значны ўклад у патрыятычнае выхаванне моладзі, рэалізацыю грамадска-культурных праектаў. У новым навучальным годзе мы працягнем працу над новымі культурнымі і выхаваўчымі праектамі. Усім жадаем здароўя, працавітасці, поспехаў, павагі да таго, чаго дамагліся нашы продкі, унесці свой уклад у развіццё нашай краіны, — распавяла рэктар універсітэта Наталля Карчэўская.






**Віктар ІВАНЧЫКАЎ**